# НОВАЕ Ў ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ

Л. М. КУЛЕШ

## ВЫВУЧАЕМ ГІСТОРЫЮ СУСВЕТНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Будучыня дзяржавы, народа, чалавецтва залежыць ад умельства правільна арганізаваць жыццё сёння і прадбачыць тое, што чакае нас. Нямецкі філосаф К. Ясперс сцвярджаў: «У гісторыі знаходзімся мы і наш час. Сучаснае здзяйсняецца на выснове гістарычнага мінулага, уздзейнічанне якога мы адчуваем на сабе» (Ясперс К. // Истоки истории и ее цель. М., 1991. Вып. 1. С. 22). Сацыяльна-гістарычны вопыт, вопыт пакаленняў, гістарычных эпох — галоўнае не толькі ў жыцці асобнага чалавека, але і ў лёсе грамадства.

У апошні час дыдактыка ВНУ займаецца пошукам аптымальнага варыянта выкладання гістарычных дысцыплін. Прызнанне крызісу фармацыйнай тэорыі прывяло да з'яўлення розных мадыфікацый традыцыйных сістэматычных курсаў. Так, калектыў кафедры сусветнай і айчыннай гісторыі прапануе ўпершыню распрацаваны курс «Гісторыя сусветнай цывілізацыі», заснаваны на цывілізацыйным падыходзе да даследавання гісторыі.

Гісторыя сусветнай цывілізацыі заўсёды выклікала і выклікае вялікую грамадскую цікавасць, таму што гістарычны працэс для ўсіх дзяржаў узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Вось чаму гісторыю любой дзяржавы, краіны, у тым ліку і гісторыю Беларусі, неабходна вывучаць праз прызму сусветных працэсаў.

Гэты гістарычны курс з'яўляецца спробай рэфармацыі ўяўленняў аб гістарычным працэсе з пазіцый апошніх дасягненняў сусветнай гістарычнай навукі.

Аўтары гэтага гістарычнага курса плануюць вырашыць наступныя задачы:

— замяніць фармацыйны падыход да гісторыі цывілізацыйным, пры гэтым адмовіцца ад прымітыўнага погляду на цывілізацыі мінулага як ступені, якія вядуць да вышэйшай фармацыі;

— паказаць шырокую панараму цывілізацый, якія папярэднічалі сучаснай. У тым ліку і тыя, што стаялі на прынцыпова адметных ад еўрапейскіх шляхах развіцця;

— даць ключ да расшыфроўкі самога паняцця «цывілізацыя».

Апошняя з пералічаных задач абумоўлена адсутнасцю ў гістарычнай навуцы адзінага погляду на пытанне, што такое «цывілізацыя». Практыка паказвае, што звычайна гэта слова ўжываецца ў трох значэннях:

1) 'Вызначаны гістарычны тып грамадства';

2) 'Характарыстыка культуры, узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця, асветы найбольш перадавых дзяржаў';

3) 'Перыяд развіцця чалавецтва, наступны за эпохамі дзікасці і варварства'.

Для гісторыка зразумела, аб чым ідзе гаворка ў першым выпадку. Гэта асобныя грамадствы са сваёй культурай, рэлігіяй, геаграфічным месцазнаходжаннем, са сваімі часавымі рамкамі — напрыклад, крыта-мікенская цывілізацыя, асіра-вавілонская, рымская, мусульманская,

еўрапейская і г. д. У аснову класіфікацыі можна пакласці геаграфічны, часавы, рэлігійны прызнакі.

У любым выпадку гісторыя цывілізацый даўно створаная, устойлівая галіна гістарычнай навукі са сваімі традыцыямі і дасягненнямі. А. Тойнбі, А. Шпэнглер, М. Вэбер, М. Барг, Л. Гумілёў і іншыя вучоныя ўнеслі буйны ўклад у развіццё гэтай сферы навуковых ведаў.

Слову «цывілізацыя» да цяперашняга часу надаецца і другое значэнне, якое мае ненавуковы характар і абазначае дзяржавы, дзе людзі жывуць па-чалавечы, дастойна.

Трэцяе значэнне слова «цывілізацыя» шырока выкарыстоўвалася тады, калі ідэя прагрэсу толькі пачынала авалодваць масавым розумам і ўмацоўвалася вера у тое, што дзікасць і варварства адышлі ў мінулае.

Але вопыт XX ст. паказаў, што гэта не так і дзікасць (дзікунства) можа праявіцца ва ўмовах суцэльнай пісьменнасці.

Мы трактуем цывілізацыйны працэс як сацыяльны прагрэс, як удасканальванне грамадства. У гэтым сэнсе канцэпцыя цывілізацыі ўключае тры асноўныя моманты.

1. Мерай цывілізацыйнага працэсу аб'яўляецца чалавек, яго свабода, магчымасці, яго самаразвіццё, самарэалізацыя. Другімі словамі: агульнацывілізацыйнымі працэсамі прызнаюцца толькі тыя, што садзейнічаюць рэалізацыі агульначалавечых каштоўнасцей.

2. Мы лічым, што ўсім гэтым крытэрыям адпавядае вопыт развіцця заходняй цывілізацыі, у рамках якой склаўся капіталізм.

3. Нарэшце, канцэпцыя цывілізацыйнага працэсу заснавана на пераконанні магчымасці стварэння адзінай сусветнай цывілізацыі. Пры гэтым асноўная ўвага аўтараў удзяляецца каштоўнасцям духоўнай культуры і сацыяльнай псіхалогіі.

У канцэптуальнай частцы нашага гістарычнага курса разглядаецца развіццё поглядаў на цывілізацыйны працэс, суадносіны цывілізацыйнага і фармацыйнага падыходаў, высвятляюцца асноўныя каштоўнасныя аспекты.

У раздзеле «Цывілізацыі старажытнасці» у цэнтры ўвагі — усталяванне светаадчування чалавека, усведамленне ім сябе як індывідуальнасці, афармленне ўяўленняў аб асноўных духоўных каштоўнасцях. Старажытныя цывілізацыі даследуюцца двояка: як з пункту гледжання іх самакаштоўнасці, так і з пункту гледжання ўкладу ў гістарычны працэс.

Пры асвятленні варварства і сярэдневечча робіцца спроба выкрыць духоўны свет людзей таго часу, асаблівасці іх успрымання навакольнай рэчаіснасці. Падкрэсліваецца, што свет варвараў абапіраўся на ваенную ідэалогію, якая з'яўлялася асноўным стымулам развіцця гэтага грамадства. Пераасэнсоўваецца характар узаемаадносін варвараў з рымскай цывілізацыяй. Дэталёва аналізуюцца каштоўнасныя сістэмы асноўных слаёў сярэдневяковага грамадства. Даецца прынцыпова новая ацэнка ролі каралеўскай улады і хрысціянства, канцэпцыя чалавека і яе мадыфікацыі ў рыцарскай і гарадской культуры.

У раздзеле «Еўропа ў пердіндустрыйны перыяд» даследуецца сістэма каштоўнасцей новага часу, сфарміраваная Адраджэннем, Рэфармацыяй і развіццём капіталістычных адносін. У сувязі з ідэалогіяй пратэстанства, асветнікаў, вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі і тэхнічнымі дасягненнямі XV—XVIII стст. высвятляюцца перадумовы ўзнікнення сучаснай індустрыяльнай цывілізацыі.

Цывілізацыя Усходу падаецца, натуральна, як альтэрнатыўны еўрапейскаму шлях развіцця. Асноўны акцэнт тут робіцца на прынцыповай розніцы псіхалогій еўрапейца і прадстаўніка ўсходняй цывілізацыі.

У раздзеле «Цывілізацыя Расіі» даецца абгрунтаванне асобага шляху Расіі ў сусветным цывілізацыйным працэсе з прычыны асаблівасцей яе геаграфічнага становішча, гістарычнага развіцця і псіхалогіі насельніцтва.

У наступных раздзелах гэтага курса аналізуецца ўздзеянне на стан грамадства індустрыяльнай цывілізацыі. Прыводзяцца як агульныя рысы, так і канкрэтныя сюжэты сучаснага этапа цывілізацыйнага развіцця. У прыватнасці, даецца азначэнне сацыяльнай структуры грамадства, выяўляюцца сутнасць і змест, асноўныя элементы і ўнутраныя працэсы,

супярэчнасці і тэндэнцыі яго развіцця. Разам з тым тут знайшлі адлюстраванне і сацыяльна-палітычныя праблемы асобнага чалавека.

Шмат увагі ўдзяляецца таксама сучасным праблемам вайны і міру, рэформаў і рэвалюцый, дэмакратыі і таталітарызму. Асобная глава вучэбнага курса прысвечана актуальнейшаму пытанню сучаснасці —стану нацый і нацыянальным адносінам.

Інтарэс прадстаўляюць і праблемы палітычнай улады, каранёў яе структуры, суадносін паняццяў «улада» і «масы», узаемадзейнасць палітычнай сферы з іншымі сферамі грамадскага жыцця, сутнасць улады ў нашым грамадстве. Значнае месца займае даследаванне духоўных каштоўнасцей сучаснай цывілізацыі. Асобны раздзел курса прысвечаны глабальным праблемам сучаснасці: выжывання на зямлі ў сувязі з ядзернай пагрозай, лакальнымі канфліктамі і войнамі, знішчэннем прыродных рэсурсаў, экалагічнай, дэмаграфічнай, энергетычнай праблемамі, адмоўнымі вынікамі НТР і г. д.

Завяршае курс кароткі гістарычны агляд «Беларусь у сусветным гістарычным працэсе», дзе асобнымі штрыхамі акрэсліваецца месца Беларусі ў сусветнай гісторыі, вызначаецца яе асаблівасць у гістарычным развіцці ў параўнанні з іншымі краінамі.

Знешняя разнастайнасць матэрыялаў курса не парушае іх унутранага адзінства. Уважлівае вывучэнне гэтых матэрыялаў дапаможа студэнтам асэнсоўваць сусветна-гістарычны працэс у яго непасрэдным дачыненні да гісторыі Беларусі.